**НОВАЯ ФАРМАЦЫЯ**

У Пінску выбралі лагатып маладзёжнай сталіцы года

# БЛЯСК ПАЛЕСКАЙ ЖАМЧУЖЫНЫ

04→

**Лагатып сімвалізуе бясконцасць магчымасцей для маладых людзей. Ён выкананы ў выглядзе акружнасці, якая складаецца з сямі рознакаляровых блокаў. У цэнтры кампазіцыі — надпіс «Пінск Маладзёжная сталіца — 2020» і герб горада. У кожным з блокаў знаходзіцца графічная выява: хакеіст, веласіпедыст, футбаліст, скрыпічны ключ і ноты, скейтар, танцоры, фарбы. Яны сімвалізуюць магчымасці, што прадастаўляе Пінск кожнаму маладому чалавеку, які хоча рэалізаваць свой патэнцыял, у самых розных сферах.**

Фота БЕЛТА

9 771991 532009 20016

У Пінску выбралі лагатып маладзёжнай сталіцы года

# БЛЯСК ПАЛЕСКАЙ ЖАМЧУЖЫНЫ



Пінск прапануе моладзі шырокія магчымасці.

Фота Аляксандра КУШНЕРА

— Маладзёжнай сталіцай можа быць абраны горад, у якім створаны ўсе ўмовы для камфортнага жыцця, адукацыі, працы, культурнага адпачынку, заняткаў спортам, — зазначыла Валянціна Кулак, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Пінскага гарвыканкама. — Наш горад даўно імкнуўся да гэтага статуса, у нас маюцца ўсе неабходныя рэсурсы і пляцоўкі. Маладыя людзі могуць атрымаць вышэйшую адукацыю ў Палескім дзяржаўным універсітэце, сярэднюю спецыяльную — у дзевяці ліцэях і каледжах. Для аматараў спорту і прыхільнікаў здаровага ладу жыцця ёсць шыкоўная спартыўная база: басейн, лыжаролерная траса, спартыўныя залы, футбольны стадыён. Працуюць чатыры спартыўныя школы, чатыры школы мастацтваў і каледж мастацтваў. Палескі драматычны тэатр, канцэртная зала, бібліятэка, музей беларускага Палесся — усюды можна з карысцю бавіць вольны час. Гады два таму ў гістарычным цэнтры Пінска з'явілася і свая «пешаходка» — цэнтр маладзёжнай тусоўкі. Там праходзяць фестывалі, конкурсы, выступленні творчых калектываў самай рознай накіраванасці.

Такім чынам, на думку арганізатараў, лагатып поўнасцю адлюстроўвае магчымасці, якія горад прапануе моладзі.

На конкурс было пададзена каля 20 заявак. У выніку ў аснову лягла канцэпцыя Марыны Труш, супрацоўніцы мясцовай тэлерадыёкампаніі.

Заўтра ў Пінску пройдзе ўрачыстае адкрыццё рэспубліканскага свята «Маладзёжная сталіца Рэспублікі Беларусь — 2020», на якое прыедуць таленавітыя юнакі і дзяўчаты з усёй краіны. Удзел у ім прымуць і студэнты, а таксама выкладчыкі БДПУ імя Максіма Танка, якія накіраваліся ў 55-ы інтэрнацыянальны «Зорны паход» па месцах баявой і працоўнай славы беларускага народа. У Пінску прадстаўнікі «Зорнага фэста» правядуць прафарыентацыйныя майстар-класы. Студэнты, прадстаўнікі БРСМ, валанцёры два дні будуць працаваць на розных інтэрактыўных пляцоўках. Ну і, зразумела, там, дзе моладзь, не абыдзецца без забаў: можна будзе наведаць экскурсіі, спектакль «Пінская шляхта», танцавальны марафон.

> **На конкурс было пададзена каля 20 заявак. У выніку ў аснову лягла канцэпцыя Марыны ТРУШ, супрацоўніцы мясцовай тэлерадыёкампаніі**

**Аксана НЕЎМЯРЖЫЦКАЯ**
nevmer@sb.by